*Таццяна СТАРАСЦЕНКА*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ КАМУНІКАТЫЎНЫХ МАДЭЛЕЙ БЕЛАРУСКАГА АЎКТАРЫЯЛЬНАГА НАРАТЫВУ

**Науковий вісник Ужгородського університету. Серія: Філологія.**
**Випуск 2(46)**
**УДК 81'38:811.161.3** **DOI:10.24144/2663-6840/2021.2(46).227–233**

**Старостенко Т.** Рэпрэзентацыя камунікатыўных мадэлей беларускага аўктарыяльнага наратыву; кількість бібліографічних джерел – 10; мова білоруська.

**Анатацыя.** У артыкуле на вялікім фактычным матэрыяле празаічных тэкстаў беларускіх класікаў пачатку, сярэдзіны і канца XX ст. праведзены аналіз моўных сродкаў рэпрэзентацыі ўзаемадзеяння розных суб'ектаў мастацкага аўктарыяльнага наратыву. Разгледжаны аўтарскія адступленні як кампазіцыйныя кампаненты тэксту з актуалізацыяй яго дыстаксіі, або парушэння паслядоўнай лінейнасці маўлення. Вызначаны семантычныя сувязі, якія кантамінуюць аўтарскі і персанажны пункты гледжання праз супастаўленне і супрацьпастаўленне. Паказана асаблівасць утварэння інварыянтных мадэлей камунікацыі паміж наратарам і чытачом, аўтарам і чытачом на аснове граматычных сродкаў (дэйктыкаў, дзеясловаў загаднага ладу і сумеснага дзеяння) і прыналежнасць інварыянтных мадэлей да знешняй дыялагізацыі. Прааналізавана дынаміка камунікатыўнай прасторы празаічнага дыскурсу XX ст. на аснове ідыястыляў пісьменнікаў.

Актуальнасць даследавання заключаецца ў вылучэнні і разглядзе спецыфікі стварэння камунікатыўнасці не толькі паміж аўтарам і наратарам, а і паміж аўтарам і персанажам, наратарам і чытачом, аўтарам і чытачом, што дазваляе асэнсаваць разнастайнасць дынамікі камунікатыўнай прасторы мастацкага дыскурсу.

Мэтай артыкула з'яўляецца пашырэнне камунікатыўнай магчымасці аўктарыяльнага наратыву на ўзроўні разгляду моўнай рэпрэзентацыі не толькі мадэлі «аўтар – наратар», а і мадэлей «аўтар – персанаж», «наратар – чытач», «аўтар – чытач» у творах вядомых беларускіх пісьменнікаў. З пастаўленай мэты вынікаюць наступныя задачы: размежаваць тэкставыя сегменты рознаўзроўневых маўленчых інстанцый празаічнага твора; прааналізаваць моўную рэпрэзентацыю ўзаемадзеяння суб'ектаў мастацкага дыскурсу; выявіць спецыфіку ідыястыляў пісьменнікаў на аснове імпліцытнай дыялагізацыі і яе моўнага выражэння.

На аснове праведзенага даследавання выяўлена адметнасць стварэння і рэалізацыі камунікатыўнасці ў аўктарыяльным наратыве розных часавых перыядаў XX ст., вызначана падабенства і адрозненне ў моўнай арганізацыі і ўзаемадзеянні тэкставых суб'ектаў у залежнасці ад спецыфікі ідыястыляў пісьменнікаў.

**Ключавыя словы:** аўтар, наратар, персанаж, чытач, аўктарыяльны дыскурс, камунікатыўная мадэль.

**Пастаноўка праблемы.** На сучасным этапе развіцця камунікатыўнай стылістыкі празаічнага мастацкага тэксту неабходна звяртаць увагу на асаблівасці стварэння імпліцытнай дыялагізацыі аўктарыяльнага аповеду і яе моўнай эксплікацыі. Застаецца недаследаваным лінгвістычны аспект ўзаемаадносін паміж суб'ектамі аўктарыяльнага беларускага празаічнага дыскурсу. Патрабуе асэнсавання вылучэнне і аналіз камунікатыўных мадэлей (КМ) «аўтар – персанаж», «аўтар – наратар», а таксама інварыянтных «наратар – чытач», «аўтар – чытач».

**Аналіз даследаванняў.** Яшчэ на пачатку XX ст. даследчыкам стылістыкі В.У. Вінаградавым было ўстаноўлена, што ва ўнутрытэкставай маналагічнай прасторы празаічнага дыскурсу ў складаным дыялагічным узаемадзеянні знаходзяцца звязаныя з вобразам аўтара сэнсавыя інстанцыі моўцы, апавядальніка, персанажа. Унутраная дыялагізацыя як аблігатарная прымета мастацкага дыскурсу, асабліва калі мець на ўвазе маналагічную форму маўлення з экзегетычным апавядальнікам (або аўктарыяльны тып аповеду, звязаны з нараталагічнай структурай), у камунікатыўнай стылістыцы разглядаецца пераважна на ўзроўні камунікацыі паміж недыегетычным наратарам і персанажам і знаходзіць пэўнае тэрміналагічнае найменне: *тэкставая інтэрферэнцыя* [Шмид 2008, с. 191], *маўленчая інтэрферэнцыя* [Бахтин 1998, с. 431], *паліфанізм* [Плеханова 2003, с. 129], *дыялагічнасць* [Падучева 1996, с. 336].

У артыкуле ставіцца **мэта** пашырэння камунікатыўнай магчымасці аўктарыяльнага наратыву на ўзроўні вылучэння і моўнай рэпрэзентацыі не толькі КМ «аўтар – наратар», а і КМ «аўтар – персанаж», «наратар – чытач», «аўтар – чытач» у творах вядомых беларускіх пісьменнікаў Кузьмы Чорнага, М. Гарэцкага, М. Зарэцкага, А. Васілевіч, В. Адамчыка, І. Шамякіна, Г. Далідовіча.

Для дасягнення пастаўленай мэты выкарыстаны семантыка-стылістычны і супастаўляльна-стылістычны **метады даследавання**.

**Разгляд асноўнага матэрыялу.** Пры характарыстыцы КМ «аўтар – персанаж» варта адрозніваць аўтарскі сегмент ад наратарскага. Так, тэкстава постпазіцыйны наратар КМ «наратар – персанаж» сэнсава звязаны з персанажам і свае вывады робіць на аснове папярэдняга фокусу героя. Аўтарскія адступленні не маюць цеснай сэнсавай і стылістычнай сувязі з пунктам гледжання «іншага». Іх дыстаксічны характар садзейнічае парушэнню паслядоўнай лінейнасці і ўзнікненню рэтардацыі. На думку В.А. Сысоева, «аўтарскае адступленне можна лічыць невялікім тэкстам» [Сысоев 2008, с. 3], пры гэтым даследчык прызнае, што яно ўключае вобразы-«медыятары» разумення канцэптуальнай сістэмы твора і таму мае цесную ўзаемасувязь з цэлым тэкстам [Сысоев 2008, с. 5].

Неабходна звярнуць увагу і на граматычны аспект аўтарскага адступлення: увод сентэнцыі ў наратыў суправаджаецца звычайна пераходам з прошлага часу ў цяперашні час сентэнцыі. Такі час набывае характар гнамічнага, уласцівага агульным сцвярджэнням, або, як яго называе І.А. Мяльчук, «ахранічнага са значэннем ‘заўсёды’, ‘у агульным выпадку’, ‘незалежна ад канкрэтнага моманту’» [Мельчук 1998, с. 66]. Мяркуем, што аўтарская сентэнцыя мае дастаткова незалежны характар ад сюжэта твора, тады як наратар больш цесна звязаны з развіццём падзей і ўдзелам у іх іншых суб’ектаў аповеду.

Рэалізацыя КМ «аўтар – персанаж» адбываецца праз супастаўленне і супрацьпастаўленне на ўзроўні суб’ектывацыі аўктарыяльнага аповеду ў бок светаадчування героя і сентэнцыі аўтарскага адступлення з экспрэсіяй лагічнага паглыблення, што апелюе да інтэлектуальнай сферы чытача, або эмацыянальнай з накіраванасцю на актывізацыю пачуццяў адрасата. Аўтарскія адступленні як кампазіцыйныя кампаненты тэксту актуалізуюць яго дыстаксію, або парушэнне паслядоўнай лінейнасці маўлення, і садзейнічаюць запаволенню дзеяння. Такое запаволенне, тым не менш, звязана з наратарскім аповедам семантычнымі сувязямі, якія кантамінуюць аўтарскі і персанажны пункты гледжання праз супастаўленне і супрацьпастаўленне.

Гэтыя два эфекты прысутнічаюць у празаічным дыскурсе М. Гарэцкага, супастаўленне – у М. Зарэцкага і Кузьмы Чорнага. Супастаўленасць суб’ектных планаў збліжае пункты гледжання персанажа і аўтара, пры гэтым экспрэсіўнасць аўтарскага адступлення заключаецца ў рацыянальным паглыбленні сюжэта і вербалізуецца праз розны аб’ём сінтаксічнай структуры – мінімальнай у Кузьмы Чорнага (ад аднаго ці двух сказаў) або прэдыкатыўнай часткі канструкцыі няўласна-простай мовы, што ўяўляе найбольш шчыльную логіка-граматычную кантамінацыю празаічных суб’ектаў: ...*цяпер ён як бы прыгнуўся перад жалезнаю хадою падзей: усё робіцца само па сабе, незалежна ад яго, і яму толькі астаецца чакаць – можа, і міне яго страшная навала; ну, або старацца быць далей ад усяго і бліжэй да самога сябе;* ***сам сабе чалавек не вораг!*** (Кузьма Чорны. «Сямнаццаць год»). Лагічнасць аўтарскай сентэнцыі вербалізуецца ў стылістычна нейтральных камунікатыўных структурах сказаў з цяперашнім пастаянным як прэзенсу каментарыя.

Эфект супрацьпастаўлення персанажнага і аўтарскага пунктаў гледжання, выяўлены ў М. Гарэцкага, актуалізуе сэнсавую апазіцыю на аснове лексіка-стылістычнага падабенства. Эксплікацыя аўтарскай пазіцыі, якая кантрастуе з персанажнай, уводзіцца супраціўным злучнікам *але* (*аднак*) у кантэкст лагічнай аргументацыі складаназалежнага сказа: *Усцешаны варочаўся назад галоўны кухар: князь быў да яго дужа ласкавы, пагаманіў з ім і нават даў пацалаваць сабе ў руку.* ***Але колькі ўжо выпадкаў было ў гісторыі, што з самае вяршыні чалавек раптоўна звальваўся ў самае бяздонне плачу і адчаю*** (М. Гарэцкі. «Смачны заяц»).

Экспрэсіўнасць аўтарскай суб’ектнай перспектывы ў КМ «аўтар – наратар» мае рацыянальны аспект у Кузьмы Чорнага і эмацыянальны – у М. Гарэцкага і М. Зарэцкага. Для рэалізацыі гэтай мадэлі Кузьма Чорны выкарыстоўвае ўключанасць у наратарскі аповед аўтарскага адступлення на ўзроўні некалькіх прэдыкатыўных частак («Буланы»), аднаго сказа («Сямнаццаць год»), складанага сінтаксічнага цэлага («Вялікае сэрца», «Заўтрашні дзень»). Суб’ектыўна-ацэначная мадальнасць аўтарскага эстэтычнага адлюстравання вербалізуецца ў іменных прэдыкатах: *жыццё – бязмернае і неабдымнае*; *сэнс яго – у радасці* («Буланы»), *час – найлепшы доктар чалавеку* («Вялікае сэрца»), *бура – хаос, патрэбны для аднаўлення гармоніі* («Парфір Кіяцкі»), паралелізме сінтаксічных канструкцый з анафарыстычным паўторам дзеяслова існавання з семантыкай футуральнасці: *Будзе, як і раней, пахнуць у лагчынах травою, будуць у сонечныя дні вятры гнаць пыл па дарогах, будуць хмары палівацъ зямлю дажджом, а пасля глядзець на макрату ды смяяцца сонцу. Будзе ўзнімацца ў свеце ў істотах радасць, будзе ападаць да смутку, зноў пасля ўзнімацца...* («Буланы»), што дазваляе супаставіць успрыманне розных аб’ектаў рэчаіснасці ў агульным паняцці кантраснага свету, прэдыкатыве *трэба* ў спалучэнні з інфінітывам як актуалізатары значэння неабходнасці: *Трэба ведаць, што без веры ў чалавека не можа трымацца не толькі сям’я або сяброўства двух, але і цэлая дзяржава* («Заўтрашні дзень»). Прамы парадак слоў аўтарскіх адступленняў Кузьмы Чорнага нясе на сабе адбітак справядлівай ацэнкі адлюстраваных фактаў, іх адэкватнага ўспрымання і аналізу. Эмацыянальны аспект экспрэсіўнасці аўтарскага «я» КМ «аўтар – наратар» дыскурсаў М. Гарэцкага і М. Зарэцкага паглыбляе суб’ектную наратарскую перспектыву, узбагачаючы яе дадатковымі эмацыянальна-экспрэсіўнымі нюансамі.

Адрозненне вербалізацыі мадэлі «аўтар – наратар» М. Гарэцкага і М. Зарэцкага ў тым, што першы дапаўняе яе прагматыка-камунікатыўнай накіраванасцю да чытача, у выніку чаго ўзнікае інварыянт «наратар – чытач», а М. Зарэцкі ўносіць выразныя лінгвістычныя сігналы, пераважна стылістычнага характару, аўтарскіх адносін у апавядальны маналог. Разгледзім гэта на канкрэтных прыкладах.

У апавяданні «Мар’я» М. Зарэцкага дыктум наратара стылістычна нейтральнай безасабовай канструкцыі *пачынала днець...* са шматкроп’ем імплікуе пераход да аўтарскага фрагмента з тэматычнай лініяй (ТЛ) «Восень», прадстаўленай дзвюма ядзернымі структурамі з адносінамі перасячэння. Першая – клічны сказ *І хто можа забараніць шчыра і моцна любіць цябе, жоўта-тужлівая, сумная восень!* – знаходзіць паглыбленне-аргументацыю ў кантэкстным акружэнні праз сінанімізацыю славазлучэнняў з архісемай ‘прырода’: *жоўта-тужлівая, сумная восень*; *пара адцвітання*; *смутнае, ціхае хараство*; *кволая, празрыстая пазалота*; *глыбока-тужлівыя шчырыя подыхі*; *жоўты плач адцвітання*; *панура-сумнае аблічча*.

Другая ядзерная структура – *І хто можа забараніць любіць цябе, чароўна-смутная восень чалавечага жыцця!* – уключае аксіюмаранны эпітэт, сутнасць якога раскрываецца кантраснымі вобразамі сімвалічнай восені ў пытальна-рытарычных сказах з экспрэсіяй сцвярджэння: *Хіба мала харастваў гэтым адцвітанні душы, у гэтым сумна-пакорным развітанні з уцехамі, забавамі маладосці? Хіба не прыгожы гэтыя астатнія абуджэнні паволі засынаючага сэрца, гэтыя астатнія гулліва-радасныя выбухі заміраючага жыцця, гэтыя астатнія запозненыя асеннія кветкі?*, якія актуалізуюць архісему ‘чалавек’. Складваецца паралелізм знешняга і ўнутранага планаў, прыроднага і чалавечага, з працягам у апавядальных сказах наратарскага светапогляду. Маркёрамі эмацыянальнасці аўтарскага адступлення выступаюць клічна-пытальная рытарычная структура, назоўныя тэмы, развітыя звароткі, эпітэты, параўнанні, метафары. Іх канвергенцыя эксплікуе суб’ектыўна-ацэначную аўтарскую мадальнасць.

Інварыянт «наратар – чытач» КМ «аўтар – наратар» рэалізуецца ў аповесці М. Гарэцкага «Ціхая плынь». Эмацыянальны фрагмент аўтарскага адступлення з ядром *Мы ўсе ў гады прачнавання нашага розуму – рэфарматары нягоднага старога, будаўнікі лепшай спецыяльнасці, славутыя настаўнікі ці добрыя разбойнікі, але часта-часта жыццё нічагусенькі не пакідае нам і робіць жаласнымі старцамі без пары*, якое эксплікуе філасофскі роздум над сутнасцю рэалізацыі чалавека ў жыцці і ў аснове мае супрацьпастаўленне прэдыкатыўных частак з актыўным суб’ектам *мы* і яго пасіўным варыянтам, пераключае ўвагу на далейшую ТЛ наратара.

Неабходна звярнуць увагу на той факт, што дэйктык *мы* па сваёй сутнасці адрозніваецца ў публіцыстычным і мастацкім дыскурсе. Так, даследчык мастацкай публіцыстыцы Уладзіміра Караткевіча П.П. Жаўняровіч уключае у суб’ект публіцыстычнага дыскурсу *мы* аўтара і аб’екта яго даследавання пры ўмове іх асабістага знаёмства, аўтара і некалькі асоб, якія разам выконваюць пэўныя дзеянні, аўтара ў складзе групы асоб (так званы «інклюзіўны суб’ект»), аўтара як частку няпэўна-абагульненай групы людзей [Жаўняровіч 2011, с. 55–57]. У публіцыстыцы дэйктык *мы* выражае, у першую чаргу, асобу самога стваральніка тэксту (публіцыста) і яго рэальнае акружэнне – спадарожнікаў, сяброў, аднадумцаў і інш. У мастацкай літаратуры *мы* аўтарскага адступлення, якое па-філасофску ацэньвае рэчаіснасць, дазваляе зрабіць жыццёвыя высновы блізкімі і зразумелымі рэцыпіенту, ён разам з аўтарам перажывае падзеі і факты, ацэньвае іх, таму твор становіцца неад’емным цэлым унутранага свету чытача. На наш погляд, адрозненне паміж аўтарскім адступленнем і наратарскім сегментам у тым, што аўтар больш адасоблены ад сюжэта ў сваёй сентэнцыі, тады як наратар цесна звязаны з падзейным развіццём твора.

Суб’ектны план апавядальніка выразна праяўляецца ў мантажным кампазіцыйным прыёме, сутнасць якога заключаецца ў тым, што праз позірк назіральніка аб’ект можа то набліжацца, то аддаляцца, выглядаць у агульным або ў буйным плане. Мантажнае пісьмо аповесці М. Гарэцкага «Ціхая плынь» адлюстроўвае змену планаў: ад агульнага (вёска), да сярэдняга (бедная хацінка) і буйнога (няшчаснае дзіця), пры гэтым уключае зварот да чытача. Форма такога звароту эксплікуецца праз дэйктык-адрасант *вы* (*Ці траплялася вам бываць на вёсцы…*), маркіраваныя публіцыстычным стылем дзеясловы загаднага ладу (*… не грэбуйце, не бойцеся запэцкаць рукі і ўпіхніце лахманы… Зірніце на пол*) і сумеснага дзеяння (*Але паглядзім*). Прыведзеныя актуалізатары адрасата-чытача сведчаць пра знешнюю дыялагізацыю інварыянтнай мадэлі, камунікатыўная сутнасць якой характэрна найперш для публіцыстыкі.

Дыстаксія празаічнага тэксту на ўзроўні аўтарскіх адступленняў з экспрэсіяй як лагічнага, так і эмацыянальнага паглыблення нарацыі заўважана ў КМ «аўтар – персанаж» А. Васілевіч на ўзроўні як сказа, так і макрапрапазіцыі, якую мы звязваем з узроўнем звышфразавага адзінства. Персанаж і аўтар пры гэтым знаходзяцца ў адносінах супастаўлення. Зближэнне суб’ектных перспектыў ставарае дыялагізацыю разумення праз кантэкст аднаго сказа лагічнай аўтарскай сентэнцыі як працягу персанажнага фокусу: *Засталася адна са сваёй радасцю, якую не хацела паказваць усім.* ***Вялікая радасць, як і вялікае гора, любіць часам застацца сам-насам*** («Шляхі-дарогі»). Такі працяг у А. Васілевіч рэпрэзентуецца і экспрэсіяй эмацыянальнага аўтарскага адступлення – рытарычнага пытання: *Яны слухалі яе, і кожны думаў, як ні прыйдзецца яму цяжка, а перамагчы гэту цяжкасць трэба. Перамагчы і выйсці пераможцам.* ***Што можа быць больш шчырым, светлым і смелым, чым мары моладзі?*** («Шляхі-дарогі»). Прэзенс каментарыя цяперашняга пастаяннага аўтарскай пазіцыі «выводзіць аповед за межы часавай плоскасці, у якой развіваюцца падзеі» [Кожевникова 1977, с. 10].

Лагічная аўтарская сентэнцыя ў А. Васілевіч вербалізуецца і на ўзроўні макрапрапазіцыі, супастаўляючыся з персанажнай сферай. Імперфект Міхала аб’ядноўваецца з прэзенсам аўтара семай ‘шчасце’. Пункт гледжання Міхала *Па сутнасці, нічога пэўнага не абяцаючы Міхалу, пачуццё гэта ўзнімала яго, прыдавала яму больш сілы і бадзёрасці, маладзіла* з сінтаксічным суб’ектам-увасабленнем актыўнага ўплыву на духоўную сферу працягваецца ў аўтарскай макрапрапазіцыі з аксюмаранным варыянтам тэмы «Шчаслівая хвароба»: *Вельмі складаная рэч – каханне. І як ні дзіўна, ні адзін чалавек на свеце яшчэ не растлумачыў як след, што ж гэта за шчаслівая такая хвароба, якая лечыць, паднімае на ногі слабых, улівае бадзёрасць і энергію пасіўным, робіць добрымі злосных. Праўда, часам бывае і наадварот: добрых і ціхіх людзей даводзіць яно да шаленства* («Шляхі-дарогі»). Вобраз кахання разгортваецца дынамічна ў шчыльнасці дзеяслоўных прэдыкатаў прамога парадку слоў як персанажнага, так і аўтарскага сегмента.

Для дыскурсу А. Васілевіч характэрна экспрэсія аўтарскага адступлення з рацыянальным

(сентэнцыйным) і эмацыянальным (асабістымі адносінамі да прэсупазіцыі) бакамі КМ «аўтар – наратар». Дзякуючы аўтарскаму сегменту з рэтардацыйным уплывам на тэкст запавольваецца дынаміка лінейнага разгортвання зместу, што дазваляе абгрунтаваць пэўную сітуацыю. Размешчаныя дыстантна, адступленні аўтара ў прэпазіцыі ці постпазіцыі да наратарскага аповеду садзейнічаюць філасофскаму паглыбленню твора, новай ацэнцы падзей і фактаў. Семантычная сувязь, якая кантамінуе аўтарскі і наратарскі пункты гледжання, у А. Васілевіч мае характар супастаўлення. Аўтарскі сегмент-сентэнцыя з філасофскім абагульненнем эксплікуецца постпазіцыйна ў адносінах да фокусу апавядальніка праз структуру аднаго сказа і рэалізуе суб’ектыўна-ацэначную мадальнасць у іменным прэдыкаце: *Шчасце* ***крылатае****: і само ляціць, і людзей нясе на крылах* («Шляхі-дарогі»), у развітым прыдатку: *Каханне –* ***гэта пужлівая птушка*** *– не любіць, калі за ім наглядаюць чужыя няпрошаныя вочы* («Шляхі-дарогі»), у кампаратыўнай канструкцыі: *Нарэшце, для кожнай маці* ***даражэй за ўсё*** *на свеце – гэта яе дзеці* («Пратасевіч»).

У прозе А. Васілевіч аўтарскае адступленне можа вербалізавацца прэпазіцыйна да наратарскага дыскурсу ў фрагменце з дзвюма макрапрапазіцыямі. Яго агульная тэма з сімвалічным асэнсаваннем «Восень» раскрываецца ў мікратэмах «Восень прыроды» і «Восень чалавека» («Шляхі-дарогі»). Ядро 1-й макрапрапазіцыі – складаны бяззлучнікавы сказ *Ёсць такі між восенню і летам пераходны дзень: выйдзеш на двор і раптам упершыню не ўбачыш – адчуеш: набліжаецца восень* – эксплікуе рэферэнтную сітуацыю змен у прыродзе, якая звязана са зменамі ў жыцці чалавека, што зместава працягвае ядзерная структура 2-й макрапрапазіцыі – складаназалежны сказ канстатацыі: *І вось у адзін такі, як і ўсе іншыя, дзень чалавек убачыць у люстэрку, што скроні яго пасрэбрыў іней сівізны*. Знаходзячыся ў адносінах перасячэння, ядзерныя структуры, звязаныя агульнай семай ‘сталасць’, садзейнічаюць стварэнню інтэграванай мадэлі свету, дзе прыродны і чалавечы пачаткі ўзаемаабумоўлены. Псіхалагізацыя пейзажа дасягаецца вобразнымі азначэннямі *вясёлая* (вясна), *панурая, сумотная* (восень), што дазваляе аўтару адлюстраваць у прыродным свеце суб’ектыўнасць чалавечых адчуванняў.

У 1-й макрапрапазіцыі мэтазгодна, на наш погляд, вылучыць інварыянт «аўтар – чытач», паколькі рэлевантная КМ «аўтар – наратар» набывае ў аўтарскім сегменце прагматыка-камунікатыўную накіраванасць да чытача, у выніку чаго стыль аўтарскага адступлення выразна карэлюецца з публіцыстычным. Канектарны рад адрасата-чытача, сфарміраваны займеннікамі *твой*, *цябе*, падмацоўваецца дзеяслоўнымі формамі 2-й асобы *выйдзеш*, *не ўбачыш*, *адчуеш*, *паглядзіш*, *прыгледзішся* з кантэкстуальнай семантыкай цяперашняга пастаяннага. Гэта дазваляе наблізіць аўтарскую сентэнцыю да чытача ў эмацыянальным плане праз актуалізацыю эфекту суперажывання. Прэдыкатыўныя часткі *выйдзеш на двор і раптам упершыню не ўбачыш – адчуеш*; *Але паглядзіш зноў вакол, бліжэй да ўсяго прыгледзішся* як абагульнена-асабовыя сказы набываюць суб’ектыўнае абагульненне, паколькі дзеянне накіроўваецца да любога адрасата (кожнага), аб’яднанага з аўтарам агульнымі адчуваннямі, перажываннямі. «Значэнне абагульнена-асабовых сказаў абумоўлівае іх важную ролю ў мадэляванні дыялога “аўтар – адрасат”» [Кувшинникова 2014, с. 68], таму такія канструкцыі нясуць камунікатыўную нагрузку і адпаведна фарміруюць «генерытыўны маўленчы рэгістр» (тэрмін Г. А. Золатавай [Золотова 2002, с. 16]) з абагульненым характарам меркавання і выхадам за межы тэкставага часу. Эксплікацыі тыповых, паўторных дзеянняў садзейнічаюць дзеясловы футуральнай семантыкі закончанага трывання, ужытыя ў камунікатыўна арыентаваных частках.

У празаічным дыскурсе канца ХХ ст. выяўляецца тэндэнцыя да скарачэння аўтарскіх адступленняў, што не было характэрна для папярэдніх часавых перыядаў (мастацкія дыскурсы пачатку і сярэдзіны ХХ ст. рэалізавалі аўтарскія сентэнцыі на ўзроўні як некалькіх сказаў, так і больш буйных структурных тэкставых адзінак – празаічных строф і фрагментаў). У творах В. Адамчыка, І. Шамякіна, Г. Далідовіча аўтарскія адступленні з экспрэсіяй лагічнага паглыблення нарацыі рэпрэзентуюцца на ўзроўні аднаго або двух сказаў і ўтвараюць з персанажным сегментам адносіны супастаўлення (Г. Далідовіч), супрацьпастаўлення (І. Шамякін), супастаўлення і супрацьпастаўлення (В. Адамчык).

Падабенства супрацьпастаўленых суб’ектных пунктаў гледжання ў І. Шамякіна і В. Адамчыка ў тым, што аўтарскі сегмент уводзіцца супраціўным злучнікам *але*, які можна разглядаць у якасці сэнсаўтваральнай тэкставай адзінкі і маркёра выразнага пераключэння персанажнага пункту гледжання на аўтарскі: *Тыя жаніхі былі так сабе, а гэты, чарцяка, занадта ж сімпатычны і прыкметны: такога дзяўчо магло па-сапраўднаму пакахаць.* ***Але ж хіба сутнасць чалавека ў спартыўнай постаці і прыгожых валасах?*** (І. Шамякін. «Крывінка»); *Якая ж, зрэшты, шчаслівая маладосць у сваім памкненні і парыве да патаемнае і зваблівае будучыні.* ***Але як негадана і па-іншаму складваецца жыццё*** (В. Адамчык. «Развітальная аповесць»). Прычым такое пераключэнне дазваляе аўтару нагадаць пра сваю мастацкую прысутнасць, якая можа ацэньваць падзеі з іншага боку, аб’ектыўнага, што з’яўляецца формай выражэння актыўнай аўтарскай пазіцыі.

Супастаўляючыся, персанажны і аўтарскі фокусы ў В. Адамчыка і Г. Далідовіча падобныя ў аўтарскім адступленні з дзеяслоўнымі формамі 2-й асобы як маркёрамі імпліцытнага наладжвання кантакту з адрасатам-чытачом і такім чынам выхадам на знешні, пазатэкставы дыялог: *Хочаш таго ці не хочаш, неяк заўсёды спачатку вельмі няўлоўна, а пасля больш выразна, трывожна адчуваеш усё новае, верыш, што яно будзе прыемнае, прынясе вялікую радасць* (Г. Далідовіч. «Юля»). Аўтарская сентэнцыя В. Адамчыка набывае больш выразную ў параўнанні з аўтарскай сентэнцыяй Г. Далідовіча накіраванасць

да адрасата, што эксплікуецца не толькі ўжо адзначанымі дзеяслоўнымі формамі, але і дэйктыкам *ты*. Гэта садзейнічае актуалізацыі інварыянтнай мадэлі «аўтар – чытач»: *Чым ты болей жывеш, тым болей чужых жыццяў і лёсаў укладваецца ў тваё жыццё, і яно робіцца нібы не тваім, расплываючыся і растаючы ў глыбокай далечыні гадоў, у бачаным і перажытым* (В. Адамчык. «Развітальная аповесць»). Аўтарскае адступленне В. Адамчыка з відавочным камунікатыўным імкненнем уключае і дэйктык *мы* як рэпрэзентант інтымізацыі з адрасатам: *Іншы раз мы доўга і ўпарта ідзём да свае мэты, але, убачыўшы яе зблізку, нечакана адступаемся назад. Які ж, зрэшты, зменлівы і бязвольны ў сваіх памкненнях чалавек* («Развітальная аповесць»). У адрозненне ад аўтарскіх адступленняў І. Шамякіна і Г. Далідовіча, дзе аўтар выражае ўпэўненую пазіцыю, сентэнцыя ў В. Адамчыка можа ўключаць мадальнае слова праблематычнай верагоднасці, што сведчыць пра няспешнасць і ўдумлівасць: *У маладосці чалавек да неразважнасці і адчаю болей рашучы, таму, пэўна, маладому лягчэй паміраць: з гадамі ён ашчадна даражыць гэтым сваім і не сваім жыццём* («Развітальная аповесць»).

Такая ж адметнасць аўтарскага адступлення В. Адамчыка характэрна і для КМ «аўтар – наратар». Варта адзначыць, што менавіта ў гэтага празаіка выяўляецца найбольшая ў параўнанні з І. Шамякіным і Г. Далідовічам разнастайнасць дзвюх КМ. Экспрэсія аўтарскага адступлення лагічнага і эмацыянальнага тыпу характэрна для І. Шамякіна і В. Адамчыка, рацыянальнага (сентэнцыйнага) – для Г. Далідовіча. Паміж наратарскім сегментам і аўтарскім (які размешчаны постпазіцыйна на ўзроўні аднаго-двух сказаў) вербалізуюцца адносіны супастаўлення (ва ўсіх траіх празаікаў) і супрацьпастаўлення (у В. Адамчыка). Стрыманы ў аўтарскай сентэнцыі, Г. Далідовіч адрозніваецца ад здольнага праяўляць эмацыянальныя адносіны да пазіцыі наратара І. Шамякіна і асабліва – ад экспрэсіўнага В. Адамчыка. У апошняга аўтарская экспрэсія эмацыянальнага тыпу з адносінамі супрацьпастаўлення эксплікуецца на ўзроўні прэдыкатыўнай часткі наратарскага сказа з маркёрам пераключэння суб'ектнага плана – супраціўным злучнікам *але* і асобнага нячленнага сказа з семантыкай катэгарычнай упэўненасці: *...Гэнрык Самец уцякаў ад свае адзіноты і адчужанасці, ад страху перад чужымі могілкамі і гнятлівага адчування свае блізкае смерці,* ***але хіба можна ад усяго накананаванага ўцячы? Не!*** («Развітальная аповесць»).

Рацыянальнасць аўтарскага адступлення, супастаўляючыся ў сэнсавых адносінах з наратарам, набывае ў «Развітальнай аповесці» В. Адамчыка прагматыка-камунікатыўную накіраванасць да чытача і набліжаецца да публіцыстыкі. Уздзеянне на знешняга адрасата адбываецца праз дэйктык *мы* і мадальнае слова праблематычнай верагоднасці *мусіць* з семантыкай няпэўнасці ўласнага меркавання, што садзейнічае эфекту сутворчасці: чытач далучаецца да сцвярджэння ў пошуку ісціны: *Мусіць, праўда, што нас падцікоўвае і вартуе смерць там, дзе мы яе наймені чакаем*. Аўтарская сентэнцыя набывае ў В. Адамчыка і мадальнае значэнне катэгарычнай верагоднасці: *Сапраўды, за смерцю нас чакае смерць*. Уласцівыя аўтарскім адступленням як упэўненасць, так і няўпэўненасць сведчаць пра набліжанасць аўтара да чытача, лабільнасць эмацыянальнага стану і дынаміку разгортвання пункту гледжання на свет.

Аўтарская сентэнцыя І. Шамякіна, пазбаўленая, у адрозненне ад В. Адамчыка, мадальных слоў, разгортваецца ў лагічным плане і наладжвае знешнюю дыялагізацыю з чытачом праз займеннік і дзеяслоўныя формы 2-й асобы: *А бессмяротнасці ўсім хочацца: разумеючы, што фізічнай не бывае, мімаволі думаеш аб душы – каб хоць у снах яна наведвала блізкіх і прымушала іх не забывацца на цябе, пакутніка* («Крывінка»). Такая ж пераканаўчая аўтарская сентэнцыя і Г. Далідовіча, якая, працягваючы наратарскі сегмент у супастаўляльных адносінах, уносіць дадатковую сему рэальнасці.

На аснове прааналізаванага матэрыялу можна зрабіць наступныя **вывады**. Дыялог КМ «аўтар – персанаж» звязаны з актуалізацыяй пункту гледжання героя і сентэнцыі аўтарскага адступлення, якія маюць характар супастаўлення і супрацьпастаўлення ў дыскурсе М. Гарэцкага, супастаўлення – у М. Зарэцкага і Кузьмы Чорнага. Аўтарскія адступленні рэалізуюцца праз мінімальны аб'ём сінтаксічнай структуры (ад аднаго да двух сказаў) у Кузьмы Чорнага да фрагментаў у М. Гарэцкага і М. Зарэцкага. Аўтарская суб'ектная перспектыва КМ «аўтар – наратар» мае рацыянальны аспект у Кузьмы Чорнага і эмацыянальны – у М. Гарэцкага і М. Зарэцкага. Рацыянальнасць аўтарскага ўспрымання Кузьмы Чорнага эксплікуецца праз прамы парадак слоў, паралелізм сінтаксічных канструкцый. Суб'ектная наратарская перспектыва М. Зарэцкага ўзбагачаецца эмацыянальна-экспрэсіўнымі канатацыямі прысутнасці аўтара ў пытальна-рытарычных сказах, кантраснасці вобразаў, назоўных тэмы, развітых зваротках. Для М. Гарэцкага характэрны інварыянт мадэлі «наратар – чытач» з прагматыка-камунікатыўнай накіраванасцю праз маркіраваныя публіцыстычным стылем дэйктык *вы*, дзеясловы загаднага ладу і сумеснасці дзеяння. Рэалізацыя КМ «аўтар – персанаж» заўважана толькі ў дыскурсе А. Васілевіч. Персанаж і аўтар знаходзяцца ў адносінах супастаўлення, пры гэтым аўтарская сентэнцыя цяперашняга пастаяннага структурна арганізуецца як сказ і макрапрапазіцыя. У КМ «аўтар – наратар», характэрнай таксама для прозы А. Васілевіч, выяўляюцца адносіны супастаўлення паміж аўтарскім і наратарскім пунктамі гледжання. Постпазіцыйная аўтарская сентэнцыя-сказ рэпрэзентуецца ў іменным прэдыкаце, развітым прыдатку, кампаратыўнай канструкцыі. Прэпазіцыйнае аўтарскае адступленне мае структуру фрагмента з інварыянтам «аўтар – чытач». У празаічным дыскурсе канца ХХ ст. назіраецца рэдукцыя аўтарскіх адступленняў КМ «аўтар – персанаж» да аднаго-двух сказаў. Экспрэсія лагічнага паглыблення

аўтарскай сентэнцыі выяўляе з персанажным сегментам адносіны супастаўлення (Г. Далідовіч), супрацьпастаўлення (І. Шамякін), супастаўлення і супрацьпастаўлення (В. Адамчык). У.Г. Далідовіча і В. Адамчыка аўтарскае адступленне ўключае маркёры пераходу на знешні дыялог (з чытачом) – дзеясловы 2-й асобы, у В. Адамчыка – яшчэ і дэйктыкі *ты*, *мы*. Рэдукаваныя аўтарскія адступленні вызначаюць і спецыфіку КМ «аўтар – наратар», у якой найбольшую экспрэсію мае аўтарская сентэнцыя В. Адамчыка з прагматыка-камунікатыўнай накіраванасцю да чытача. Аўтарская сентэнцыя І. Шамякіна наладжвае сутворчасць з чытачом праз займеннікі і дзеяслоўныя формы 2-й асобы. Стрыманы ў рацыянальным аўтарскім адступленні, Г. Далідовіч уносіць у яго сему няспешнасці.

**Літаратура**


1. Бахтин М.М. Тетралогия. Москва: Лабиринт, 1998. 608 с.
2. Жаўняровіч П.П. Публіцыстычны дыскурс Уладзіміра Караткевіча. Мінск: РІВШ, 2011. 244 с.
3. Золотова Г.А. Категории времени и вида с точки зрения текста. *Вопросы языкознания.* 2002. № 3. С. 8–29.
4. Кожевникова Н.А. О соотношении речи автора и персонажа. *Языковые процессы современной русской художественной литературы. Проза.* Москва: Наука, 1977. С. 7–98.
5. Кувшинникова О.А. Способы выражения авторской позиции в художественном тексте (на материале прозаической миниатюры Ю.Д. Поминова «Очищение»). *Текст как единица филологической интерпретации.* Новосибирск: Немо Пресс, 2014. С. 67–70.
6. Мельчук И.А. Курс общей морфологии. Москва-Вена: Языки русской культуры, Венский славистический альманах, 1998. 544 с.
7. Падучева Е.В. Семантические исследования (Семантика времени и вида в русском языке; Семантика нарратива). Москва: Языки русской культуры, 1996. 464 с.
8. Плеханова Т.Ф. Текст как диалог. Минск: МГЛУ, 2003. 251 с.
9. Сысоев В.А. Авторское отступление как объект когнитивного исследования: автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. филол. наук: спец. 10.02.22 – языки народов зарубежных стран (английский язык). Алматы, 2008. 30 с.
10. Шмид В. Нарратология. Москва: Языки славянской культуры, 2008. 304 с.


**References**


1. Bakhtin M.M. (1998) Tetralogiya [Tetralogy]. Moskva: Labirint. 608 s. [in Russian].
2. Zhaunyarovich P.P. (2011) Publitsystychny dyskurs Uladzimira Karatkevicha [Public discourse of Uladzimir Karatkevich]. Minsk: RIVSH. 244 s. [in Belarusian].
3. Zolotova G.A. (2002) Kategorii vremeni i vida s tochki zreniya teksta [Categories of time and type from the point of view of the text]. Voprosy yazykoznaniya. № 3. S. 8–29 [in Russian].
4. Kozhevnikova N.A. (1977) O sootnoshenii rechi avtora i personazha. Yazykovye protsessy sovremennoi russkoi khudozhestvennoi literatury. Proza [On the relationship between the speech of the author and the character. Language processes of modern Russian fiction. Prose]. Moskva: Nauka. S. 7–98 [in Russian].
5. Kuvshinnikova O.A. (2014) Sposoby vyrazheniya avtorskoi pozitsii v khudozhestvennom tekste (na materiale prozaicheskoi miniatiury Yu.D. Pominova «Ochishcheniye») [Ways of expressing the author’s position in a literary text (based on the prose miniature by Yu.D. Pominov “Purification”)]. Tekst kak yedinitsa filologicheskoi interpretatsii [Text as a unit of philological interpretation]. Novosibirsk: Nemo Press. S. 67–70 [in Russian].
6. Melchuk I.A. (1998) Kurs obshchei morfologii [Course of general morphology]. Moskva-Vena: Yazyki russkoi kultury [Languages of Russian Culture], Venskii slavisticheskii almanakh. 544 s. [in Russian].
7. Paducheva E.V. (1996) Semanticheskiye issledovaniya (Semantika vremeni i vida v russkom yazyke; Semantika narrativa) [Semantic studies (Semantics of time and aspect in Russian; Semantics of narrative)]. Moskva: Yazyki russkoi kultury. 464 s. [in Russian].
8. Plekhanova T.F. (2003) Tekst kak dialog [Text as dialogue]. Minsk: MGLU. 251 s. [in Russian].
9. Sysoev V.A. (2008) Avtorskoye otstupleniye kak obyekt kognitivnogo issledovaniya [Author’s Digression as an Object of Cognitive Research]: avtoref. dis. na soisk. uchen. step. kand. filol. nauk: spets. 10.02.22 – yazyki narodov zarubezhnykh stran (angliiskii yazyk). Almaty. 30 s. [in Russian].
10. Shmid V. (2008) Narratologiya [Narratology]. Moskva: Yazyki slavyanskoi kultury. 304 s. [in Russian].


## REPRESENTATION OF COMMUNICATION MODELS OF BELARUSIAN AUCTORIAL NARRATIVE


**Abstract.** In the article, based on a large factual material of the prose texts of the Belarusian classics of the beginning, middle and end of the 20th century, an analysis of the linguistic means of representing the interaction of various subjects of the auctorial narrative is carried out. The author’s digressions are considered as compositional components of the text with the actualization of its distaxia, or violation of the sequence. The semantic connections that contaminate the author’s and character’s points of view through comparison and opposition are determined. The peculiarity of the formation of invariant communication models of the narrator and the reader, the author and the reader on the basis of grammatical means and the

belonging of the invariant models to external dialogization are shown. The dynamics of the communicative space of the prose discourse of the 20th century is analyzed on the basis of the idiostyles of the writers.

The relevance of the study lies in highlighting and considering the specifics of creating communication not only between the author and the narrator, but also between the author and the character, the narrator and the reader, the author and the reader, which makes it possible to comprehend the diversity of the communicative space of artistic discourse.

The purpose of the article Is to expand the communicative possibility of the audience narrative at the level of considering the linguistic representation of not only the "author-narrator" model, but also the "author-character", "narrator-reader", "author-reader" models in the works of famous Belarusian writers. The following tasks follow from the goal set: to distinguish between text segments of multi-level speech instances of a prose work; analyze the linguistic representation of the interaction of subjects of artistic discourse; to reveal the specifics of writers' idiostyles on the basis of implicit dialogization and its linguistic expression.

On the basis of the study, a feature of the creation and implementation of communicativeness in the auctorial narrative of different time periods of the 20th century was revealed, similarities and differences in the language organization and interaction of text subjects were determined, depending on the specifics of the idiostyles of writers.

**Keywords:** author, narrator, character, reader, audience discourse, communicative model.

## РЕПРЕЗЕНТАЦІЯ КОМУНІКАТИВНИХ МОДЕЛЕЙ БІЛОРУСЬКОГО АУКТОРІАЛЬНОГО НАРАТИВУ

**Анотація.** У статті на великому фактичному матеріалі прозових текстів білоруських класиків початку, середини та кінця XX століття проведено аналіз мовних засобів репрезентації взаємодії різних суб'єктів аукторіального наративу. Розглянуто авторські відступи як композиційні компоненти тексту з актуалізацією його дистаксії, або порушення послідовності. Визначено семантичні зв'язки, що контамінують авторську та персонажну точки зору через зіставлення та протиставлення. Продемонстровано особливість утворення інваріантних моделей комунікації наратора та читача, автора та читача на основі граматичних засобів та належність інваріантних моделей до зовнішньої діалогізації. Проаналізовано динаміку комунікативного простору прозового дискурсу XX століття на основі ідіостилів письменників.

Актуальність дослідження полягає у виділенні та розгляді специфіки створення комунікативності не лише між автором та наратором, а й між автором та персонажем, наратором та читачем, автором та читачем, що дозволяє осмислити різноманіття комунікативного простору художнього дискурсу.

Метою статті є розширення комунікативної можливості аукторіального наративу на рівні розгляду мовної репрезентації не лише моделі «автор–наратор», а й моделей «автор–персонаж», «наратор–читач», «автор–читач» у творах відомих білоруських письменників. З поставленої мети випливають такі завдання: розмежувати текстові сегменти багаторівневих мовних інстанцій прозового твору; проаналізувати мовну репрезентацію взаємодії суб'єктів художнього дискурсу; виявити специфіку ідіостилів письменників на основі імпліцитної діалогізації та її мовного вираження.

На основі проведеного дослідження виявлено особливість створення та реалізації комунікативності в аукторіальному наративі різних часових періодів XX століття, визначено схожість та відмінність у мовній організації та взаємодії текстових суб'єктів залежно від специфіки ідіостилів письменників.

**Ключові слова:** автор, наратор, персонаж, читач, аукторіальний дискурс, комунікативна модель.

© Старостенко Т., 2021 р.

**Тетяна Старостенко** – кандидат філологічних наук, доцент кафедри мовознавства та лінгводидактики Білоруського державного педагогічного університету імені Максима Танка, м. Мінськ, Білорусь; tstarascienka@gmail.com; https://orcid.org/0000-0002-1632-6721

**Tetyana Starostenko** – Candidate of Philology, Associate Professor of the Department of Linguistics and Linguodidactics, Maxim Tank Belarusian State Pedagogical University, Minsk, Belarus; tstarascienka@gmail.com; https://orcid.org/0000-0002-1632-6721